# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі*

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

# 85 гадоў

***Колас, Я. Вайна вайне: Драма ў IV актах / Якуб Колас. – Менск [Мінск]: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі «Мастацкая літаратура», 1938. – 50, [1] с.***







Драма Якуба Коласа «Вайна вайне» адлюстроўвае падзеі, звязаныя з пачаткам Першай сусветнай вайны і перарастаннем яе ў грамадзянскую. Але першае асобнае выданне твора змяшчае фактычна трэцюю яго рэдакцыю.

П’еса была напісана на працягу 1926–1931 гг., першапачаткова мела назву «Вайна да пабеднага канца» і складалася з 5 актаў. Гэты варыянт быў апублікаваны ў часопісе «Полымя» ў № 2 за 1927 год і №№ 11 і 12 за 1931 г. У 1931 г. Якуб Колас аддаў тэкст артыстам Другога Беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-2, цяпер – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, Віцебск). Падчас падрыхтоўкі спектакля аўтар зрабіў у тэксце п’есы шматлікія змяненні. Выпраўлены варыянт пад назваю «Вайна вайне» быў надрукаваны ў тым жа часопісе ў № 10 за 1936 г. (у 1932–1941 гг. часопіс выходзіў пад назвай «Полымя рэвалюцыі»).

23.10.1937 г. рукапіс п’есы паступіў у друкарню Акадэміі навук БССР, дзе яна была падпісана да друку 28.01.1938 г.

Тыраж выдання склаў 2000 экзэмпляраў. Кніга выйшла без ілюстрацый, мастацкае мінімалістычнае аздабленне мела толькі вокладка.

# «*Вайна вайне: Драма ў IV актах*» : 85 гадоў

Падчас Першай сусветнай вайны ў 1915 г. у сувязі з набліжэннем фронту Якуб Колас разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню, дзе ў верасні быў прызваны ў Рускую імператарскую армію. Вайсковую службу пачаў у 55-м запасным пяхотным батальёне ў Маскве. Пасля заканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча ў 1916 г.  быў накіраваны ў Перм. У ліпені 1917 г. Якуба Коласа прызначылі начальнікам эшалона і накіравалі на румынскі фронт, але ў хуткім часе паэт цяжка захварэў і, атрымаўшы адпачынак, прыехаў у Абаянь (цяпер горад у Курскай вобласці Расіі), дзе з сынамі Данілам і Юркам жыла Марыя Дзмітрыеўна, жонка паэта. Як настаўнік Якуб Колас быў вызвалены ад вайсковай службы, і працаваў выкладчыкам, школьным інспектарам у Абаяні і яго акрузе.

Ужо пасля вяртання ў Беларусь Якуб Колас адлюстраваў падзеі Першай сусветнай вайны, «салдацкую праўду» ў драме «Вайна да пабеднага канца», якая ў канчатковай рэдакцыі атрымала назву «Вайна вайне».



Якуб Колас, 1916 г.

# «*Вайна вайне: Драма ў IV актах*» : 85 гадоў

Па вызначэнні літаратурных крытыкаў, п’еса «Вайна вайне» — гэта сацыяльная драма. Яе тэма — барацьба супраць войнаў, якія прыносяць народам безліч страшэнных бед.

Дзеянне ў драме разгортваецца падчас Першай сусветнай вайны, а заканчваецца пачаткам Грамадзянскай вайны 1918–1920 гг. Галоўныя дзеючыя асобы твора — сяляне-беднякі Аслаў, дзед Мікіта, яго сын Міхась, бабыль Дзяменя, а таксама сяляне-сераднякі Дроб, Гузыр, шахцёр Думака Патап, бальшавік Максім Кучаравы, настаўнікі Алесь і Марына, стараста, поп, кулак Бухрай, земскі начальнік абшарнік Будан-Рыльскі, ураднік Шышла, афіцэр-ліберал Жухін.

Найбольш поўна ў драме раскрыты вобраз Алеся. Гэта былы палітссыльны, пакараны царскімі ўладамі за рэвалюцыйную прапаганду. Ён, апынуўшыся на фронце, з першых дзён вядзе гутаркі, распаўсюджвае лістоўкі, згрупоўвае вакол сябе салдат, стрымлівае празмерна «гарачых», разварушвае занадта памяркоўных. Калі яму пагражае арышт, радавы Алесь Шабура становіцца радавым Макарам Макаруком, але ўсё роўна працягвае смела гаварыць аб паражэнні царскай Расіі ў вайне, арганізуе братанне, выступае на мітынгах. Сілу яго перакананняў успрымае Марына, якая спачатку выступае як пацыфістка і не разумее, як можна зычыць паражэнне сваёй краіне. Праўду Алеся прымае і нявытрыманы Гузыр, які абураны несправядлівасцю і нахабствам капітана Будана Рыльскага, і нават салдаты-ўсмірыцелі, якія гатовы былі ўзняць руку на паўстаўшых. Распачынаючы вайну вайне, Алесь марыць, каб хутчэй наступіў той момант, калі фронт «замрэ» назаўсёды і наступіць мірны час.

Такім чынам, у драме «Вайна вайне» адлюстроўваны працэс паступовага ўсведамлення салдатамі несправядлівага характару вайны і іх братання з салдатамі варожых армій; паказаны прадст аўнікі розных палітычных сіл — бальшавікі і эсэры, якія па-рознаму ўяўлялі шляхі далейшага развіцця падзей пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года і вялі змаганне за душы і розум салдат.

# «*Вайна вайне: Драма ў IV актах*» : 85 гадоў

Вядомы літаратурны крытык У. Б. Карпаў, аналізуючы драму Якуба Коласа «Вайна вайне», пісаў пра яе праблематыку так: «Сапраўды, праблема, узнятая ў драме, актуальная і жыццёва важная (была і застаецца) для ўсіх народаў. Больш таго, актуальнасць яе ўзрасла, набыла новае гучанне і будзе ўзрастаць далей. Праблема была пастаўлена і вырашана Якубам Коласам як праблема лёсу і будучыні народаў. Драматург перакрыжаваў жыццёвыя дарогі дзясяткаў людзей — рабочых, сялян, інтэлігентаў, памешчыкаў, царскіх чыноўнікаў і афіцэраў, — паказаў, як паміж імі разгарэлася гістарычная барацьба: за вайну і вайну да пераможнага канца адных, за мір і вайну вайне другіх, як гэта барацьба прыйшла да свайго лагічнага канца. Іншымі словамі, драма ахоплівае рэчаіснасць шырока, бярэ яе ў рэвалюцыйным развіцці і ўзнаўляе плынь падзей у натуральнай паслядоўнасці, строга падпарадкаванай мастацкай логіцы. Нарэшце, прывабнасць драмы хаваецца ў глыбокай праўдзівасці і маляўнічасці яе агульнай карціны, ва ўменні драматурга проста, ясна і хораша расказаць аб людзях з народа, іх барацьбе і лёсе, у дынамічным дыялогу драмы, у якім амаль кожная рэпліка нясе ў сабе пэўны зарад, што рухае дзеянне, у сакавітай гутарковай мове прадстаўнікоў народа».

# «*Вайна вайне: Драма ў IV актах*» : 85 гадоў



Я. Колас за чытаннем п’есы «Вайна вайне» артыстам Другога Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра (БДТ-2).
Фота сайта «Архівы Беларусі»

Расказваючы пра гісторыю падрыхтоўкі і пастаноўкі спектакля «Вайна вайне» на сцэне БДТ-2, даследчыкі адзначаюць, што ў пачатку 1930-х гадоў у артыстаў гэтага тэатра скláліся творчыя сяброўскія адносіны з Якубам Коласам. Менавіта па просьбе рэжысёра тэатра Мікалая Міцкевіча пісьменнік дапісаў распачатую ў 1926 г. п’есу. Пастаноўка планавалася на май 1932 г. Але нечакана ў тэатры змяніўся рэжысёр.

Толькі ў 1936 г. новы галоўны рэжысёр тэатра Віктар Дарвішаў (1897—1951) вярнуўся да п’есы. 10 студзеня 1936 г. у Доме пісьменнікаў у Падблоні Якуб Колас прачытаў рэжысёру і артыстам тэатра свой твор, і тады ж абмеркавалі план працы над пастаноўкай п’есы. Пачалася карпатлівая работа, Якуб Колас прысутнічаў на рэпетыцыях. Генеральная рэпетыцыя трансліравалася па віцебскім радыё. Прэм’ера спектакля «Вайна вайне» адбылася 11 студзеня 1937 г.

Больш інфармацыі аб першай пастаноўцы спектакля можна даведацца на сайце Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (https://kolastheatre.by/ru/news/yakub-kolas-i-kolasovcy ).

Другі раз спектакль быў адноўлены ў гэтым жа тэатры ў 1975 г.